

*І.Э.Андрыёлі. Ілюстрацыя да паэмы «Пан Тадэвуш» А.Міцкевіча. 1882.*

Віленскай гімназіі, Маскоўскім вучылішчы жывапісу і скульптуры (1855—57), Пецярбургскай акадэміі мастацтваў (1857—59), акадэміі св. Лукі ў Рыме (1860). Працаваў у Вільні, быў звязаны з рэв. коламі. За ўдзел у паўстанні 1863—64 арыштаваны. У 1864 уцёк з ковенскай турмы за мяжу. Жыў у Лондане і Парыжы. Стварыў шмат графічных работ пра падзеі 1863—64. У 1866 вярнуўся на радзіму, быў зноў арыштаваны і сасланы ў Вятку, дзе стаў настаўнікам рус. мастакоў В. і А. Васняцовых. З 1871 у Варшаве, працягваў маст. адукацыю ў школе Герсана. У 1883—86 працаваў у Парыжы. Аўтар ксілаграфій «Паляванне на зубра» (1887), «Нападзенне татар», «Напалеон у Варшаве» (абедзве 1888) і інш. У жывапісных і графічных работах адлюстроўваў жыццё, побыт і гіст. мінулае бел. і літоўскага народаў: «Смерць Кейстута», «Сутычка ліцвінаў з крыжаносцамі», «Хрышчэнне язычнікаў», «Смерць Людвіка Нарбута каля Дубічаў». Напісаў партрэт Ф.Багушэвіча, стварыў серыі іл. да кніг Э.Ажэшка, Ю.Крашэўскага, Дж.Ф. Купера, А.Мальчэўскага, А.Міцкевіча, Ю.Славацкага, У.Сыракомлі, У.Шэкспіра.

**АНДРЫЧЫК** (Andricik) Юрай (н. 22.4.1937, в. Бежаўцы, Чэхія), славацкі паэт, перакладчык. Скончыў Ін-т рус. мовы і л-ры ў Празе (1960). Асн. тэматыка яго творчасці — прыгажосць роднай зямлі, духоўнае жыццё чалавека. Аўтар зб-каў паэзіі «Узыходжанне на зямлю» (1970), «Глухія зычныя» (1973), кн. апавяданняў для дзяцей «Павой» (1976). Пераклаў на славацкую мову кнігі «Глыток вады» М.Танка (1975), «Так лёгка крочыш» П.Макаля (1982), аповесць «Лонва» І.Пташнікава (1980), зб. бел. паэзіі «Моваю сэрца» (1977, з Г.Крыжанавай-Брынзавай), кн. бел. нар. казак «Чароўная дудка» (1982). Асобныя вершы П.Броўкі, Г.Бураўкіна, Н.Гілевіча, А.Грачанікава, Я.Коласа, Я.Купалы, А.Куляшова, П.Панчанкі, У.Паўлава, А.Пысіна, А.Разанава ў яго перакладзе ўвайшлі ў анталогію «Жыццё супраць смерці» (1980), «Анталогію савецкай паэзіі 20 стагоддзя» (т. 1—2, 1981). Пераклаў на славацкую мову вершы М.Багдановіча, якія ўвайшлі ў кн. «Nov» («Лістапад», Браціслава, 1990).

*В.Б.Несцяровіч.*

**АНДРЭЕЎ** (сапр. П р а к о ф ' е ў) Аляксандр Аляксандравіч (13.4.1923, Санкт-Пецярбург — 10.1.1960), рускі паэт, перакладчык, крытык. Сын А.А.*Пракоф'ева.* Скончыў Ленінградскі ун-т (1948). Аўтар зб-каў вершаў «Зорка пакаленняў» (1959) і «Сонца Ленінграда» (1961). Першыя пераклады бел. паэзіі змешчаны ў «Анталогіі беларускай паэзіі» (1948). Пераклаў паэму «Безназоўнае» і больш за 30 вершаў Я.Купалы, асобныя творы П.Броўкі, А.Куляшова, М.Танка, М.Лужаніна, В.Віткі і інш. Аўтар арт. пра А.Куляшова «Ад імя простых людзей» (кн. «Зброя міру», 1951).

**АНДРЭЕЎ** Аляксей Леанідавіч (24.2. 1920, Санкт-Пецярбург — 1999), расійскі і беларускі артыст балета, балетмайстар. Засл. артыст Расіі (1957). Засл. дзеяч мастацтваў Беларусі (1963). Скончыў Ленінградскае харэагр. вучылішча (1939). Працаваў у Ленінградскім тэатры оперы і балета



*А.Л.Андрэеў.*

імя Кірава. У 1960—64 і 1971—73 гал. балетмайстар Дзярж. тэатра оперы і балета Беларусі. Паставіў першыя бел. нац. балеты на сучасную тэму «Мара» Я.Глебава (1961), «Святло і цені» Г.Вагнера (1963). Сярод іншых пастановак: «Дон Кіхот» Л.Мінкуса (1962), «Балеро» на музыку М.Равеля (1963) і «Раймонда» А.Глазунова (1972, абедзве з Н.Стукалкінай).

**АНДРЭ́ЕЎ** Анатоль Мікалаевіч (н. 28.4.1958, г. Севераўральск Свярдлоўскай вобл., Расія), беларускі літаратуразнавец, культуролаг, пісьменнік. Д-р філал. навук (1998), праф. (2004). Скончыў БДУ (1984), з 1990 выкладае ў ім. Даследуе праблемы тэорыі л-ры, метадалогію цэласнага эстэтычнага аналізу маст. твора («Тэорыя літаратуры», ч. 1—2, 2004, і інш.), дыялектыку свядомасці («Культуралогія. Асоба і культура», 1998; «Псіхіка і свядомасць: дзве мовы культуры», 2000). Піша маст. прозу. Асн. тэма яго твораў — каханне. Аўтар раманаў і аповесцей «Лёгкі мужчынскі раман» (2001), «Для каго ўзыходзіць сонца?», «Маргінал» (абодва 2006), «Апельсіны на асфальце» (2008).

*Тв.*: Целостный анализ литературного произведения. Минск, 1995; Методология литературоведения. Минск, 2000.

*І.М.Гоўдзіч.*

**АНДРЭЕЎ** Андрэй, майстар разьбярскай і сталярнай справы 17 ст. Ро-